**Андрыковіч, У.** Вайна ў памяці / У. Андрыковіч // Патрыёт (Ушачы). — 1989. — 23 лют. — С. 2.

## ВАЙНА Ў ПАМЯЦІ

Вестка аб тым, што абмежаваны вайсковы кантынгент нашай краіны нарэшце пакінуў Афганістан напэўна не пакінула раўнадушнымі нікога, асабліва нас – афганцаў. Мне давялося служыць, а больш дакладна, ваяваць на афганская зямлі у 1981–83 гадах у дэсантна-штурмавой брыгадзе.

Чаго каштавала мая служба для маёй маці Тамары Уласаўны! За тыя два гады яна пасівела. І гэта не ведаючы аб тым, што я быў там паранены. Я, наогул, не хацеў, каб яна ведала, дзе служу, ды толькі сэрца матчына не спадманеш, даведалася. Хілю да таго, што колькі маці зрабіла гэтая вайна няшчаснымі і колькі магла яшчэ зрабіць.

У Афганістане таксама служыў мой брат Аляксандр і муж сястры. Сям'і нашай пашчасціла, бо ўсе мы ўтрох вярнуліся жывымі.

Ёсць у мяне пасведчанне ўдзельніка вайны, якім пакуль амаль не карыстаюся. Проста патрэбы няма. Працую ў саўгасе імя Даватара машыністам кармацэху. Жыву з маці. Пакуль не жанаты, так што асаблівых праблем не маю...

Праблему бачу ў іншым. Вось стварылі ў раёне клуб воінаў-інтэрнацыяналістаў, а памяшкання свайго прыстойнага не маем. Давялося пабываць у гасцях баявога сябра, які жыве ў Краснадарскім краі, іхні клуб працуе ў памяшканні з вялікай залай, куды запрашаюць да размоў вучняў. Наш жа клуб пакуль існуе толькі на паперы. А спраў, між іншым, у воінаў-інтэрнацыяналістаў шмат.

**У. Андрыковіч**,
былы воін-інтэрнацыяналіст